АЎСЕЙЧЫК УЛАДЗІМІР
ULADZIMIR AUSEICHYK

ДА ПЫТАННЯ АБ РАССЯЛЕННІ СТАРАВЕРАЎ НА ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНІХ БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVII — ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVIII СТАГОДДЗЯ

TO THE QUESTION ABOUT THE SETTLEMENT OF THE OLD BELIEVERS IN THE NORTH-WESTERN BELARUSIAN LANDS IN THE SECOND HALF OF THE XVII — FIRST HALF OF THE XVIII CENTURY

Аннатацыя: *У артыкуле ставіцца пытанне аб пасяленні рускіх старавераў на паўночна-заходніх беларускіх землях у другой палове XVII — першай палове XVIII стагоддзя Аналізуюцца вынікі папярэдніх даследаванняў, якія закраналі дадзенае пытанне, характарызуецца іх крыніцазнаўчая база і метадалогія. Прыходзім да высновы, што, нягледзячы на наяўнасць шэрагу прац, у якіх разглядалася ранняя гісторыя старавераў у паўночна-заходнім рэгіёне Беларусі, пытанне аб іх пасяленні тут у другой палове XVII — першай палове XVIII стагоддзя застаецца нявырашаным. На сённяшні дзень у апублікаваных даследаваннях так і не было прадстаўлена аргументаваных фактаў пасялення старавераў у рэгіёне ў згаданы перыяд. А таму да цяперашняга часу застаюцца нявырашанымі і больш сур'ёзныя задачы. Так, не выяўлены месцы першапачатковага пасялення старавераў у рэгіёне, не вылучаны этапы іх засялення гэтай тэрыторыі, не прадпрынята спроба аналізу інтэнсіўнасці міграцыі і падліку колькасці прышлага насельніцтва.*

Ключавыя словы: *старавераў, паўночна-заходняя Беларусь, этнічная гісторыя, гістарыяграфія, рассяленне, этнічная група.*

Abstract: *The article raises the question about the settlement of Russian Old Believers in the north-western Belarusian lands in the second half of the XVII — first half of the XVIII century. We analyze the results of the previous studies that dealt with this issue, characterize their sources and methodology. We come to the conclusion that despite the existence of a number of works that considered the early history of the Old Believers in the northwestern*

region of Belarus, the question of their settlement here in the second half of the XVII — first half of the XVIII century remains unresolved. To date, the published studies have not provided substantiated facts of Old Believers' settlement in the region during the mentioned period. Therefore, more serious problems remain unresolved to date. Thus, the places of the initial settlement of Old Believers in the region have not been identified, the stages of their settlement of this territory have not been singled out, no attempt has been made to analyze the intensity of migration and to calculate the number of the newcomer population.

Keywords: *Old Believers, northwestern Belarus, ethnic history, historiography, settlement, ethnic group.*

Адзін з важнейшых рэгіёнаў кампактнага пражывання стараверaў у Беларусі лакалізуецца ў яе паўночна-заходніх землях. Ён уваходзіць у агульную зону рассялення стараверaў, якая ахоплівае сучаснае беларуска-літоўска-латвійскае памежжа і прылеглыя тэрыторыі. Нягледзячы на тое, што ва Усходняй Еўропе гэта адзін з самых масавых і значных рэгіёнаў кампактнага пражывання стараверaў, пытанні яго фарміравання не ў поўнай ступені вырашаны ў сучаснай гістарычнай навуцы. Асабліва гэта датычыцца беларускай часткі рэгіёна.

Стан распрацоўкі праблемы. Гісторыя і асаблівасці рассялення стараверaў у паўночна-заходняй Беларусі цікавілі не толькі айчынных навукоўцаў, але і даследчыкаў, якія займаліся вывучэннем стараверaў Літвы і Латвіі. Гэта абумоўлена ўжо згаданым вышэй фактам аб уваходжанні памежных беларускіх, літоўскіх і латвійскіх тэрыторый у адну зону кампактнага рассялення стараверaў. А таму даследаванні стараверства Літвы і Латвіі рэдка абыходзіліся без аналізу матэрыялаў з памежных беларускіх земляў.

Першай даследчыцай, якую зацікавілі пытанні рассялення стараверaў у рэгіёне, была А. А. Заварына. Яе вывучэнне праблемы пачалося яшчэ ў сярэдзіне XX стагоддзя, але найбольш поўна і сістэмна было прадстаўлена ў манаграфіі "Рускае насельніцтва ўсходняй Латвіі ў другой палове XIX — пачатку XX стагоддзя" (1986) [7]. Даследчыца вызначыла асноўныя прычыны перасялення стараверaў у рэгіён, вылучыла этапы засялення, выявіла тэрыторыі, з якіх перасялялі-

ся стараверы ў дадзеную мясцовасць. Пры гэтым А. А. Заварына адной з першых звярнула ўвагу на недастатковасць вывучэння ранняй гісторыі стараверaў на тэрыторыі Латвіі: "История переселения в Латвию старообрядцев, составивших здесь ядро русского населения, мало изучена. Исследователи не располагают массовыми архивными материалами, которые бы более или менее исчерпывающе отвечали на вопросы: почему, когда, откуда, в каком количестве русские староверы пришли в Латвию, как происходило их расселение здесь и какие районы были первыми ими освоены" [7, с. 10]. Яе словы ў поўнай меры датычацца і суседніх беларускіх земляў.

Нягледзячы на тое, што асноўная ўвага ў працы была засяроджана на ўласна латгальскіх землях, у ёй знайшлося месца і беларускім. Так, А. А. Заварына зрабіла дапушчэнне аб перасяленні значнай колькасці стараверaў-федасееўцаў у раён Браслаў — Мёры — Друя яшчэ ў канцы XVII стагоддзя [7, с. 17]. Аднак ніякіх даных, якія пацвярджалі б гэтае дапушчэнне (уласна фактаў перасялення стараверaў на беларускія землі), даследчыца не прывяла. Толькі да больш позняга перыяда яна прывяла факты перасялення стараверaў на беларускія землі. На аснове архіўных крыніц А. А. Заварына выявіла, што пасля ўваходжання Латгаліі ў склад Расійскай імперыі некаторая частка стараверaў перасяляецца ў 1780—1790-я гады з рэгіёна ў раён Браслаў — Мёры — Друя, дзе, па меркаванні даследчыцы, ужо меліся стараверскія пасяленні [7, с. 27]. У наступным вынікі і матэрыялы даследавання А. А. Заварынай былі шырока выкарыстаны ў працах іншых даследчыкаў.

У беларускай гістарыяграфіі пытані рассялення стараверaў у гэтым рэгіёне разгледжаны даволі павярхоўна. У апублікаваных даследаваннях, прысвечаных староверам на беларускіх землях, вельмі мала адведзена ўвагі характарыстыцы першапачатковаму этапу засялення яе паўночна-заходніх тэрыторый у другой палове XVII—XVIII стагоддзяў. Толькі рэдкія факты прыводзяцца ў даследаванні А. А. Гарбацкага "Стараабрадніцтва на Беларусі ў канцы XVII — пачатку XX стагоддзя" (1999) [4]. Перавыданне гэтай манаграфіі на рускай мове пад назвай "Старообрядчество на белорусских землях" адбылося ў 2004 годзе. [5]. Даследчык выказаў меркаванне, што першыя звесткі аб пасяленні стараверaў на паўночна-заходніх беларускіх землях адносіцца яшчэ да сярэдзіны XVII стагоддзя [5, с.

75]. Аднак пры гэтым ён адзначае, што "дакладных дадзеных пра час пасялення старааброднікаў па ўсіх беларускіх гарадах, мястэчках і вёсках не знойдзена. Вядомыя пакуль паасобныя даты і падзеі" [5, с. 74]. Для вызначэння першапачатковых месцаў пасялення прыхільнікаў старых абрадаў у паўночна-заходняй частцы Беларусі ў якасці крыніц А. А. Гарбацкі выкарыстоўвае амаль выключна звесткі з "Дэгуцкага летапісца" і "Положения старообрядцев в Ковенской губернии". Да даставернасці даных у гэтых крыніцах існуюць сур'ёзныя пытанні, у першую чаргу, з-за іх значнай храналагічнай аддаленасці ад тых падзей, якія яны апісваюць. Асабліва гэта датычыцца "Дэгуцкага летапісца" (другая яго назва — "Хронограф Литовский, сиречь Летописец степенный древлеправославного христианства"). Як сведчаць даследаванні, тэкст гэтай крыніцы быў створаны толькі ў сярэдзіне XIX стагоддзя [16, с. 7]. Таму ўзнікае заканамернае сумненне ў дакладнасці звестак з гэтай крыніцы, якія датычацца ранняй гісторыі старавераства. Пра шматлікія памылкі ў датах, змешчаных у тэксце, адзначаў даследчык В. Г. Маркелаў, які і ўвёў "Дэгуцкі летапісец" у навуковы зварот [11]. Разам з тым у ім гісторыя старавераства на беларускіх землях у другой палове XVII — XVIII стагоддзяў амаль не асвятляецца (упамінаецца толькі асвячэнне храма ў Відзах у 1764 годзе, гл. ніжэй).

На аснове інфармацыі з "Положения..." А. А. Гарбацкі адзначае, што пасяленне старавераў у межах Ковенскай губерніі адбылося яшчэ ў 1655 годзе. Таму ён дапускае меркаванне, што першапачатковым рэгіёнам іх пасялення на беларускіх землях былі тэрыторыі вакол Браслава, Салок і Відзаў. І адбылося гэта яшчэ ў 1655 годзе да афіцыйнага расколу Рускай праваслаўнай царквы [5, с. 75]. Але саміх фактаў знаходжання старавераў на тэрыторыі Браслаўшчыны ў гэты час даследчыкам не прыведзена.

У якасці аднаго з самых ранніх фактаў перасялення старавераў у рэгіён А. А. Гарбацкі пераказвае гісторыю, змешчаную ў "Дэгуцкім летапісцы", аб заснаванні ў 1660 годзе храма ў вёсцы Лігінішкі, што была недалёка ад г. Дынабурга, а таксама з'яўленні тут у 1667 годзе свяшчэннаіерэя Цярэнція [5, с. 75]. Але гэтыя землі не адносяцца да сучасных тэрыторый Беларусі (у наш час яны ўваходзіць у горад Даўгаўпілс, Латвія). На аснове звестках усё з таго ж "Дэгуцкага летапісца"

А. А. Гарбацкі сцвярджае, што на землях сучаснага Браслаўскага раёна першы стараверскі храм быў пабудаваны ў Відзах і благаслаўлены духоўнымі айцамі Філімонам Пятровічам і Сцяпанам Афанасічам у 1764 годзе [5, с. 77]. Як не дзіўна, але гэта першы пацверджаны крыніцай факт знаходжання стараверaў у межах паўночна-заходняй Беларусі, прыведзены ў даследаванні А. А. Гарбацкага (на яго даставернасць мы звернем увагу ніжэй).

У сваім даследаванні А. А. Гарбацкі апісвае яшчэ адну значную падзею з ранняй гісторыі стараверства на землях ВКЛ — пасяленне ў канцы XVII стагоддзя на Невельшчыне (сучасная тэрыторыя Расійскай Федэрацыі) натхняльніка і арганізатара федасееўскага саглаcа Феадосія Васільева [5, с. 75]. Навуковец, спасылаючыся на працу В. Волкава [3] і звесткі ўсё з таго ж "Дэгуцкага летапісца" ўказвае, што пасля пераезда Феадосія Васільева ў 1709 годзе ў Ноўгарад частка стараверaў з Невельшчыны перасяляецца ў Віцебскі, Полацкі, Лепельскі і іншыя паветы. І толькі на аснове гэтых даных робіць выснову, што "можна меркаваць, што федасееўцы пасяліліся на землях цяперашніх Віцебскага, Полацкага і Лепельскага раёнаў у 1655—1710 гады" [5, с. 76]. Аднак ніякіх звестак аб пасяленні стараверaў на сучасных беларускіх тэрыторыях А. А.Гарбацкі не прыводзіць. Няма такіх фактаў і ў вышэй згаданых крыніцах. Больш таго, сам В. Волкаў звяртаў увагу на адсутнасць дакладна пацверджаных даных аб з'яўленні стараверaў у рэгіёне: "до настоящего времени мы не нашли еще ни одного письменного документа, раскрывающего нам определенные годы поселения раскольников в Витебской губернии" [3, с. 50]. А таму ён прапаноўвае звярнуцца да іншай групы крыніц — аповядаў саміх стараверaў: "за неимением письменных документов о времени поселения раскольников в Витебской губернии, мы обращаемся к памяти добросовестных сторожилов-единоверцев и раскольников... Из сказаний стариков видно, что безпоповцы-федосеевцы посеились в Витебской губернии, хоть незадолго, но раньше поповцев, именно в первые годы XVIII столетия" [3, с. 47].

У сваёй працы А. А. Гарбацкі робіць дапушчэнне аб перасяленні стараверaў пасля смерці Феадосія Васільева на землі Віленскага ваяводства (па меркаванні даследчыка, галоўным чынам на тэрыторыю сучаснага Браслаўскага раёна ў Беларусі і Зарасайскага раёна Літвы).

А таму мяркуе, што Браслаў, Відзы, Зарасай, Вількамір і Свянцяны сталі аднымі з ранніх цэнтраў федасееўскага руху ў рэгіёне [5, с. 76-77]. Але гэтае сцверджанне аўтара не падмацавана ні адным фактам перамяшчэння ў гэты раён стараверскага насельніцтва ў адзначаны перыяд. Іншых звестак аб пасяленнях стараверaў у рэгіёне ў другой палове XVII—XVIII стагоддзяў у даследаваннях А. А. Гарбацкага не прыведзена.

Безумоўную цікавасць для вывучэння гісторыі пасялення стараверaў у межах паўночна-заходняга рэгіёна Беларусі ўяўляюць звесткі, прыведзеныя літоўскім гісторыкам Г. Паташэнкам у манаграфіі "Старавeрства ў Літве: другая палова XVII — пачатак XIX стагоддзя" (2006) [14]. У ёй разгледжаны не толькі ўласна літоўскія, але ўсе паўночна-ўсходнія землі ВКЛ. Таму ў даследаванні некаторае месца адведзена і сучасным беларускім тэрыторыям. У працы даследчык разгледзеў і пытанне аб заснаванні шэрагу стараверскіх прыходаў у паўночна-заходніх раёнах Беларусі (у межах Браслаўскага, Пастаўскага і Мёрскага раёнаў Віцебскай вобласці). Так, Г. Паташэнка згадвае пра заснаванне прыходаў і будаўніцтва храмаў яшчэ ў канцы XVII — пачатку XVIII стагоддзя. Сярод аднаго з першых ён называе храм у в. Кублішчына Мёрскага раёна (канец XVII ст.). Даследчык пры гэтым спасылаецца на даволі познюю крыніцу — "Памятную книжку Виленского генерал-губернаторства на 1868 год" [13, с. 386]. Гэту дату, як мяркуе Г. Паташэнка, указалі расійскія чыноўнікі, "основываясь, вероятно, на рассказах местных жителей, писали, что в конце XVII в. старообрядческий храм был построен в деревне Кублишна (ныне Кублищина) Дисненского уезда Виленской губернии" [14, с. 364]. Але трэба заўважыць, што ў самой крыніцы ў якасці меркаванай даты будаўніцтва Кублішчынскага храма ўказана ўсё XVII стагоддзе, а не яго канец: "Молельня в казенной дер. Кублишне. Престола нет; молельня именуется св. Троицкою. Построена в XVII ст., вновь починена и покрыта соломой в 1859 г." [13, с. 386]. У гэтай сувязі незразумелымі застаюцца прычыны "звужэння" Г. Паташэнкам перыяда будаўніцтва храма. Разам з тым, у якасці іншай верагоднай даты заснавання абшчыны даследчык указвае і 1745 г. Але ў гэтым выпадку ён спасылаецца на іншую крыніцу — "Спіс стараверскіх абшчын 1930-х гг." ("Список старообрядческих общин 1930-е гг.", далей — "Спіс..."). Сама гэта крыніца яшчэ больш познягa паходжання. Звесткі для яго сабраў Вышэйшы стараверскі Савет

у Польшчы (далей — ВСС) у 1930-я гг.[1] Акрамя таго, спасылаючыся на даныя гэтага "Спісу...", даследчыкам называюцца даты заснавання шэрагу іншых стараверскіх абшчын на беларускіх землях. Так, у якасці ранніх ён указвае прыходы ў в. Апідамы (1700 г.) і Кукляны (1700 г.) у Пастаўскім раёне, г. Друя (1693 г.), в. Лаўнікі (1705 г.) і в. Кірыліна (1706 г.) у Браслаўскім раёне [14, с. 145, с. 364—365].

Як і беларускі даследчык А. А. Гарбацкі, Г. Паташэнка таксама згадвае пра заснаванне абшчыны ў 1764 годзе у Відзах Браслаўскага раёна. Але ў гэтым выпадку ён спасылаецца на звесткі з "Дэгуцкага летапісца" [14, с. 424—425]. Гэты прыведзены даследчыкам факт выглядае тым больш дзіўна, бо на аснове звестак са "Спісу..." ВСС абшчына ў Відзах была заснавана яшчэ ў 1680 годзе [18, s. 318]. У сувязі з такім выбарам даты заснавання Відзскага храма на карысць звестак з "Дэгуцкага летапісца" паўстае заканамернае пытанне аб яго даверы да звестак ВСС. Бо ён ігнаруе іх пры вызначэнні даты заснавання Відзскай абшчыны, не ўказваючы на гэта прычын.

Разам з тым, Г. Паташэнка адзначае, што пакуль не знойдзена больш даставерных дакументаў аб заснаванні прыходаў (храмаў) стараверaў у паўночна-заходняй частцы ВКЛ, асабліва на беларускіх землях [14, с. 364]. А што датычыцца перыяду 1710—1750 гадоў, то ён яшчэ больш "пусты". Па яго словах, пакуль не знойдзена даных аб занаванні новых прыходаў у 1710—1750 гады на беларускіх землях [14, с. 401].

Акрамя вышэйзгаданых дат заснавання стараверскіх прыходаў (храмаў) у паўночна-заходніх беларускіх землях Г. Паташэнка яшчэ некалькі разоў засяроджвае сваю ўвагу на пасяленні стараверaў у дадзеным рэгіёне. Так, даследчык адзначае, што "Новые архивные материалы свидетельствуют о том, что в первой трети XVIII века тысячи русских эмигрантов семьями и отдельными группами уходили не только в восточную часть ВКЛ (нынешняя Белоруссия), но и в северо-западную ее часть (территория нынешней Литвы и западной Бело-

1 Па звестках Г.Паташэнкі, гэта крыніца захоўваецца ў архіве Вышэйшага Савета Дрэлеправаслаўнай паморскай царквы Літвы [14, с. 15]. Такі ж "Спіс стараверскіх абшчын", складазены ВСС у 1930-х гг., захоўваецца ў Архіве новых актаў у Варшаве (Archiwum Akt Nowych) [18, s. 318—322].

руссии)" [14, с. 151]. Аднак аніякіх прыкладаў перасялення стараверaў на заходнебеларускія землі даследчык не прывёў. Таксама ён адзначае, што «Русские эмигранты жили как на востоке и северо-востоке ВКЛ — в Минском и Полоцком воеводствах, в Гродно, так и на западе страны — в Виленском (Вильнюсском), Трокском (Тракайском), Ковенском (Каунасском) воеводствах и в Жмудском (Жемайтском) старостве» [14, с. 151]. Пры гэтым даследчык спасылаецца на шэраг дакументаў, апублікаваных у якасці дадатку да яго працы. Аднак у прадстаўленых дакументах ніякага ўпамінання аб пражыванні стараверaў на беларускіх землях у канцы XVII — першай палове XVIII стагоддзя няма.

Яшчэ ў адным месцы манаграфіі Г. Паташэнкі ізноў паўтарае вышэй прыведзены тэзіс, праўда ў крыху іншым варыянце: "Новые архивные материалы свидетельствуют о том, что в первой трети XVIII века тысячи русских эмигрантов жили как на востоке и северо-востоке ВКЛ (ныне центральная и восточная часть Белоруссии), — в Речицком повете Минского воеводства, Дисненском повете Полоцкого воеводства, в Гродно, так и на западе и северо-западе страны (территория нынешней Литвы и западной Белоруссии) — в Браславском и Поставском поветах Виленского воеводства" [14, с. 268]. У гэтым выпадку даследчык ізноў спасылаецца на ўжо вышэй згаданыя дадаткі. Калі ж пытанне адносна пасялення стараверaў у гэты перыяд у Рэчыцкім павеце не стаіць (яно даволі падрабязна разгледжана і вырашана ў гістарычнай навуцы, гл.: [2]), то з іх пасяленнем у межах іншых рэгіёнаў Беларусі (Гродна, Дзісенскі, Пастаўскі, Браслаўскі павет) існуюць пытанні. У працы яны ніяк не агучваюцца і доказаў аб рассяленні стараверaў на гэтых землях не прыводзіцца.

Такім чынам, вышэйпрыведзены аналіз публікацый аб ранняй гісторыі стараверства на паўночна-заходніх беларускіх землях дазваляе зрабіць некалькі высноў. Па-першае, у навуковых даследаваннях фактаў пасялення стараверaў у рэгіёне ў другой палове XVII — першай палове XVIII стагоддзя было апублікавана вельмі мала. Па-другое, мы маем найперш справу не з самімі пацверджанымі фактамі наяўнасці стараверскага насельніцтва ў рэгіёне ў згаданы перыяд, але часцей з дапушчэннямі даследчыкаў. Гэтыя дапушчэнні, як правіла, заснаваны на аналізе матэрыялаў з суседніх літоўскіх і латвійскіх земляў. Але

ў сваю чаргу вынікі іх даследаванняў стварылі непарушны базіс для іншых прац па ранняй гісторыі стараверства на паўночна-заходніх беларускіх землях. Многія паслядоўнікі прымалі дапушчэнні гэтых аўтараў і трансліравалі ў сваіх публікацыях. Так, апублікаваныя ў манаграфіі Г. Паташэнкі даты заснавання шэрагу стараверскіх абшчын (храмаў) на заходнебеларускіх землях у канцы XVII — пачатку XVIII стагоддзя у наступным даволі шырока сталі тыражавацца як у навуковых, так і ў навукова-папулярных публікацыях. Напрыклад, у працы С. Пастушэўскага гэтыя даты прамаюцца як цалкам пацверджаныя факты [21, s. 165]. А даследчык С. Аношка у працы "Staroobrzędowcy na białoruskich ziemiach Rzeczypospolitej Obojga Narodów w XVII—XVIII stuleciu" паўтарае за А. А. Гарбацкім наступнае: "Śmierć przywódcy fiedosiejewców stała się przyczyną powrotu grupy wyznawców na tereny Wielkiego Księstwa Litewskiego, głównie na tereny dzisiejszej Białorusi i Litwy. Brasław, Widze, Zarasaj, Wilkomierz, Święciany stały się emigracyjnymi ośrodkami tego odłamu staroobrzędowców na początku XVIII wieku" [17, s.103].

Аналіз апублікаваных дадзеных. Калі не прымаць да ўвагі факты пасялення стараверaў на суседніх з паўночна-заходнім беларускім рэгіёнам землях (паўднёвая Пскоўшчына, паўднёва-ўсходняя Латвія і ўсходняя Літва), то за перыяд другой паловы XVII — першай паловы XVIII стагоддзя з усяго комплексу апублікаваных даных застануцца толькі даты заснавання шэрагу прыходаў (храмаў), упершыню прыведзеныя ў працы Г. Паташэнкі. Апроч іх найбольш жа раннім упамінаннем аб стараверскіх пасяленнях у рэгіёне будуць толькі звесткі 1760-х гадоў. Інфармацыя гэтага часу аб месцах рассялення стараверaў у рэгіёне ўтрымліваецца ў "Реестре ... сколько именно в Польше и за какими владельцами живут в подданстве оставшие от высылки в Россию беглые великороссийские люди, и в каких слободах, сколько дворов осталось". Гэта крыніца была складзена ў 1760-х гады расійскімі чыноўнікамі. Яго тэкст апублікаваў М. І. Лілееў у сваёй працы "Из истории раскола на Ветке и в Стародубье XVII—XVIII вв." (1895) [8, с. 131—132]. У ім згаданы 13 населеных пунктаў у Браслаўскім павеце (маецца на ўвазе толькі тыя, што ўваходзяць у сучасныя межы Беларусі), у якіх налічвалася 119 стараверскіх двароў. У сучасны перыяд усе гэтыя населеныя пункты размешчаны на тэрыторыі Друеўскага сельсавета Браслаўскага раёна і Перабродзкага сельсавета Мёрскага

раёна. Трэба адзначыць, што гэты рэгіён і ў наступным з'яўляўся месцам кампактнага рассялення стараверaў.

Звернемся да аналізу даставернасці дат заснавання стараверскіх прыходаў (храмаў) у рэгіёне, якія былі прыведзены ў працы Г. Паташэнкі. Як ужо было адзначана вышэй, асноўнай крыніцай для вызначэння дат заснавання першых прыходаў у паўночна-заходняй Беларусі служаць "Спіс стараверскіх абшчын 1930-х гг." Да дакладнасці яго звестак ёсць шмат пытанняў. Сама крыніца была складзена толькі ў 1930-х гады ВСС у Польшчы, пры гэтым не вядома на аснове якіх даных. Аналізуючы іншыя дакументы ВСС, якія ўтрымліваюць факты аб ранняй гісторыі стараверства на тэрыторыі рэгіёна[2], прыходзім да высновы, што яны даволі павярхоўныя, сціслыя і мала інфарматыўныя. Таму ўзнікае заканамернае пытанне адносна наяўнасці ў гэтым "Спісе..." настолькі канкрэтных дат. Можна дапусціць, што гэтыя даты паходзяць з саміх абшчын або з якіх больш даставерных крыніц. Паспрабуем іх прааналізаваць.

Абапіраючыся на даныя "Спісу...", Г. Паташэнка публікуе наступныя даты заснавання стараверскіх прыходаў: Друя — 1693 г., Апідамы — 1700 г., Лаўнікі — 1705 г., Кірыліна — 1706 г. [14, с. 364—365]. Таксама як адну з ранніх ён упамінае абшчыну ў в. Кукляны Пастаўскага раёна (1700 г.) [14, с. 364]. Аднак у тэксце манаграфіі аўтар не патлумачыў адкуль узялася гэтая дата. У рэальнасці ж абшчына ў Куклянах была ўтворана толькі ў сярэдзіне XIX стагоддзя (у выніку аддзялення ад суседняй Апідамскай). "Спіс ..." ВСС таксама адносіць паўстанне абшчыны ў Куклянах да сярэдзіны XIX стагоддзя. У якасці даты заснавання абшчыны згаданы 1853 г., а пабудовы храма — 1858 г. [18, s. 320]. У матэрыялах самой абшчыны міжваеннага перыяду пабудова храма таксама адносілася да сярэдзіны XIX стагоддзя (1858 г.) [10, ф.1681, воп.1, спр.350, арк. 38].

У "Спісе...", які захоўваецца ў зборах Архіва новых актаў у Варшаве, заснаванне абшчыны ў Друі адносіцца ажно да 1620 года [18, s. 318].

---

2 У ходзе працы былі прааналізаваны значны аб'ём дакументаў ВСС міжваеннага перыяду, якія захоўваюцца ў Архіве новых актаў у Варшаве і Дзяржаўным гістарычным архіве Літвы.

У сваю чаргу Г. Паташэнка ўказвае іншую дату — 1693 год. Невядома па якой прычыне даныя ў гэтых двух спісах адрозніваюцца (астатнія даты такія ж самыя). Але 1620 год, зразумела, не можа ўспрымацца як дата заснавання абшчыны.

У дакуменце пазначана яшчэ адна абшчына, дата заснавання якой прыходзіцца на канец XVII стагоддзя. Гэта абшчына ў Відзах (Браслаўскі раён), годам заснавання якой указаны 1680 год [18, s. 318]. Але ў сваю чаргу Г. Паташэнка не прыводзіць яе. Даследчык, як і А. А. Гарбацкі, лічыць датай заснавання гэтага прыходу (будаўніцтвам храма) 1764 год. Яны пры гэтым спасылаюцца на матэрыялы "Дэгуцкага летапісца" (гл. вышэй).

Пры гэтым трэба адзначыць, што ў шэрагу іншых крыніц сустракаюцца даныя аб даволі раннім заснаванні стараверскай абшчыны ў Відзах. Але ўсе яны позняга паходжання. Так, пры рэгістрацыі абшчыны ў г. Відзы ў 1940-я гады вернікі-староверы ў сваёй заяве ўказалі, што абшчына дзейнічае з самага пачатку XVIII стагоддзя: "как беспрерывно действующую с 1700 года в гор. Видзы <...> под названием Успенская Видзская старообрядческая община" [6, ф. 1439, воп. 3, спр. 136, арк. 1].

Да падобных ранніх дат, якія сустракаюцца ў дакументах стараверскіх абшчын сярэдзіны XX стагоддзя, варта аднесціся насцярожана. Справа ў тым, што дата 1700 год даволі папулярная для вызначэння пачатку гісторыі асобных абшчын у рэгіёне і з'яўляецца ў пэўнай ступені міфічнай. Пра дату 1700 год, як пачатак дзеяння абшчыны ў в. Апідамы (Пастаўскі раён) згадваецца ў шэрагу крыніц 1920—1940-х гадоў, якія паходзяць з асяроддзя саміх стараверaў. Так, у заяве ўпаўнаважанаму Савета па справах рэлігійных культаў ад вернікаў Апідамскай абшчыны ў 1948 годзе было ўказана наступнае: "просим зарегистрировать нашу общину, как беспрерывно действующую с 1700 года" [6, ф. 1439, воп. 3, спр. 150, арк. 1]. Падобная формула і нават такая ж дата фігуруюць у дакументах сярэдзіны XX стагоддзя і іншых стараверскіх абшчын. Часам выкарыстоўвалася і больш позняя дата, але таксама "круглая", напрыклад, 1800 год. Так, у падобнай заяве ў адрас упаўнаважанага Савета па справах рэлігійных культаў прыхажане Кірылінскай абшчыны (Браслаўскі раён) прасілі зарэгістраваць яе як "беспрерывно действующую с 1800 года в деревне Кирилино <...> под

названием Кирилинская старообрядческая община" [6, ф. 1439, воп. 3, спр. 141, арк. 1]. У сваю чаргу, зыходзячы з даных "Спісу..." ВСС, Кірылінская абшчына мусіла быць заснавана амаль на стагоддзе раней ад агучанай у заяве.

У дакументах міжваеннага перыяду, якія паходзяць з Відзскай стараверскай абшчыны, сустракаюцца разныя даты яе заснавання і будаўніцтва храма. Так, у Рэестры Відзскай абшчыны (складзены абшчынай у 1926 г.) у якасці даты яе ўтварэння ўказана "od dawnych lat" [10, ф.1681, воп.1, спр. 43, арк. 42]. Аднак у рэгістрацыйнай картцы абшчыны (складзена абшчынай у 1928 г.) у якасці даты заснавання ўвогуле ўказаны 1663 год [10, ф.1681, воп.1, спр.43, арк. 100, арк.102].

Па выніках аналізу крыніц неабходна канстатаваць, што даставерных звестак аб пасяленні стараверaў у Відзах і ваколіцах і заснавання там абшчыны да сярэдзіны XVIII стагоддзя не выяўлена. На гэту акалічнасць звяртаў увагу яшчэ ў 1930 годзе А. Хедэман (O. Hedeman). Аналізуючы даныя інвентара Відзаў з ваколіцамі за 1731 год яму не ўдалося вылучыць тут стараверскае насельніцтва (па яго меркаванні, толькі два чалавекі з ўсіх жыхароў верагодна маглі быць аднесены да стараверaў) [20, s. 282]. У сваю чаргу даставерныя звесткі аб пасяленні ў рэгіёне стараверскага насельніцтва адносяцца да другой паловы XVIII стагоддзя. Так, згодна з данымі інвентара маёнтку Відзы Лаўчынскія ад 1780 года стараверы (згаданы як "Moskale") пражывалі ў засценках Дацішкі, Любішкі, Заблоцішкі [9, ф. 46, воп.1, спр.9, арк.979-981]. А ў матэрыялах "Візітацыі браслаўскага дэканату 1782—1783 гг." таксама згадваюцца стараверы ў гэтай мясцовасці. На старонках тэксту сустракаюцца ўпамінанні аб пражыванні стараверaў у Відзскай парафіі Браслаўскага дэканату. Але, як сведчаць дакументы, у гэты перыяд малітоўнага дому ў іх не было: "Znajdują się też Moskale rozkołowie, ale udzelnych bóżnic nie mają" [19, p. 58].

Выяўленыя даныя аб пабудове стараверамі храма ў Відзах адносяцца да яшчэ больш позняга перыяду. Аб наяўнасці стараверскага храма ў Відзах на пачатку XIX стагоддзя згадваюць некалькі крыніц. Даследчык пачатку XX стагоддзя А. Станкевіч, спасылаючыся на архіўныя звесткі, выказаў меркаванне аб будаўніцтве стараверская маленнай у Відзах яшчэ да 1800 года. Ён зрабіў такую выснову на аснове даных,

узятых з прашэння стараверaў да генерал-губернатара канца 1830-х гадоў. У ім відзскія стараверы ўказвалі, што іх храм быў пабудаваны яшчэ да 1800 года [15, с. IV].

Разбіраючы архіўныя матэрыялы сустракаем цікавыя дакументы 1820-х гадоў, якія паходзіць з асяроддзя відзскіх стараверaў. У іх утрымліваюцца даныя аб часе будаўніцтва стараверскага храма ў Відзах. Так, у адным з прашэнняў стараверaў Відзаў аб распячатанні маленнай адзначалася, што "оная построена еще в 1800 году с дозволения бывшего гражданского губернатора Фризеля" [12, ф.136, воп.1, спр.7963, арк.15]. Праўда ў наступным сваім прашэнні, крыху пазнейшым за першае, дату будаўніцтва некалькі пастарылі: "часовня построена еще в 1798 году в дозволение бывшего Виленского гражданского губернатора Ф. Фризеля" [12, ф.136, воп.1, спр.7963, арк.65адв]. А ў трэцім прашэнні стараверaў Відзаў год пабудовы храма яшчэ больш пастарылі: "часовня построена в 1780 года в дозволении бывшего Виленского гражданского губернатора Господина Фризеля" [12, ф.136, воп. 1, спр.7963, арк.66адв]. Зыходзячы з таго факту, што Іван Рыгоравіч Фрызель (Іаган Фрыдрых Фрызель) з'яўляўся грамадзянскім губернатарам Літоўскай губерні з 1799 па 1801 год, то варыянты з 1780 і 1798 гадоў выглядаюць менш верагоднымі. Такім чынам, на аснове наяўных матэрыялаў можна выказаць меркаванне аб будаўніцтве стараверскай маленнай у горадзе толькі каля 1800 год.

Звернем увагу і на іншыя абшчыны з ранняй датай пачатку сваёй дзейнасці. У якасці такой разгледзім Апідамскую абшчыну, датай заснавання якой лічыцца 1700 годзе. Гэта дата згадваецца ў "Спісе...", яна ж упамінаецца і ў заяве вернікаў 1940-х гадоў (гл. вышэй). Аднак паўстаюць пытанні адносна даставернасці гэтай даты. У дакументах абшчыны міжваеннага перыяду сустракаем розныя даты яе заснавання. Так, у рэгістрацыйнай картцы, якую падрыхтавала сама Апідамская абшчына ў 1928 годзе, у графе "data powstania gminy" указана наступнае: "z roku 1626". А ў наступнай графе "Data uznania gminy przez wladze panstwowe" указана наступная інфармацыя: "Przez wladze Rosyjskie uznana w roku 1700", а "przez wladze Rzeczpospolitej Polskiej uznana w roku 02/09/1926" [10, ф.1681, воп.1, спр.171, арк. 14]. Безумоўна, дата ў 1626 годзе нават не разглядаецца як адпаведная. Але звяртае на сябе

ўвагу той факт, што гэта дата роўна на тры стагоддзі старэй за дату зацвярджэння польскімі грамадзянскімі ўладамі (падобныя састарванні абшчын на сто ці дзвесце гадоў мы будзем бачыць і ў іншых дакументах міжваеннага перыяду). Да таго ж зразумела, што ў 1700 годзе абшчына не магла быць зацверджана расійскімі ўладамі (гэтыя землі адыйшлі ў склад Расійскай імперыі толькі ў канцы XVIII стагоддзя).

Звяртае на сябе ўвагу і дата заснавання Лаўніцкай абшчыны. Так, у якасці даты ўсталявання ў "Спісе..." ўказаны 1705 год (гл. вышэй). Але ў дакументах самой абшчыны (у рэгістрацыйнай картцы 1928 г.) у якасці даты ўтварэння ўказаны 1905 год [10, ф. 1681, воп. 1, спр. 45, арк. 24]. Як і ў выпадку з Апідамскай абшчынай назіраецца вельмі падазронае разыходжанне (у дадзеным выпадку роўна на 200 гадоў) у дакументах міжваеннага часу паміж датай зацвярджэння грамадзянскімі ўладамі і датай паўстання абшчын, што змешчаны ў "Спісе..." ВСС. Такая ж сітуацыя характэрна і для Кірылінскай абшчыны, датай заснавання якой, згодна са спісам ВСС з'яўляецца 1706 год. У рэгістрацыйнай картцы, складзенай абшчынай у 1928 годзе, у якасці даты заснавання ўказаны 1906 год, а пад датай зацвярджэння абшчыны ўрадам — 19 мая 1908 год [10, ф.1681, воп.1, спр.468, арк. 31]. Ніякіх іншых дат у справаводстве Кірылінскай і Лаўніцкай абшчын не выяўлена, а таму разыходжанні ў датах іх заснавання выглядаюць падазронымі. У "Спісе..." ВСС яны роўна на 200 гадоў адрозніваюцца ад тых дат, якія былі ўказаныя самімі абшчынамі. Прыведзеныя "разыходжанні" не адзінкавыя. Так, у "Спісе..." абшчын ВСС у якасці даты паўстання абшчыны ў в. Лучай (Пастаўскі раён) указаны 1826 г. [18, s.321]. А ў рэгістрацыйнай картцы, прадстаўленай абшчынай у ВСС у 1928 годзе, у якасці даты ўтварэння ўказаны 1926 год [10, ф.1681, воп.1, спр.30, арк. 24]. У сваю чаргу, стараверская абшчына ў в. Лучай паўстала толькі ў пачатку XX стагоддзя [1, с. 60], а таму больш ранняя дата ў Спісе ВСС відавочна памылковая.

Такім чынам, аналізуючы даты заснавання Апідамскай, Лаўніцкай і Кірылінскай абшчыны, прыведзеныя ў "Спісе..." ВСС, назіраем іх падазронае разыходжанне з іншымі крыніцамі (роўна на 200 і 300 гадоў). А, дадаючы да гэтага шэрага відавочны прыклад "састарвання" Лучайскай абшчыны (роўна на 100 гадоў), можам дапусціць наўмыснае састарэнне ў "Спісе..." ВСС даных аб вышэй згаданых абшчынах.

Складаным застаецца і пытанне аб вызначэнні даты заснавання Кублішчанскай абшчыны (сучасны Мёрскі раён), якая з'яўляецца адным з ранніх і важнейшых цэнтраў стараверства ў паўночна-заходняй Беларусі. Пра сумніўны характар вызначэння даты заснавання абшчыны ў в. Кублішчына Мёрскага раёна Г. Паташэнкам (канец XVII стагоддзя) ужо было адзначана вышэй. У сваю чаргу, згодна са "Спісам" ВСС, абшчына была ўтворана ў 1745 годзе [18, s. 319]. Але ў матэрыялах 1920-х і 1940-х гадоў, якія паходзяць з самой абшчыны, сустракаюцца і іншыя варыянты. Так, пры рэгістрацыі абшчыны ў пасляваенны час прыхажане ахарактарызавалі яе: "как беспрерывно действующую с 1735 года по настоящее время" [6, ф. 1439, воп. 3, спр. 137, арк. 1]. У сваю чаргу духоўны настаўнік Кублішчанскай царквы ў 1925 годзе пісаў, што "Кублищенский приход существует более двести лет, но лет сорок (40) в зад из него образовалось 7 приходов" [10, ф.1681, воп.1, спр.8, арк.2]. А ў карце рэгістрацыі Кублішчанскай абшчыны, складзенай у 1926 г., у якасці перыяду яе паўстання ўказаны дзве даты — 1849 г. і 1901 г. [10, ф.1681, воп.1, спр.8, арк.20]. Як бачна з вышэйпрыведзеных матэрыялаў, у крыніцах утрымліваюцца розныя даты меркаванага заснавання стараверскай абшчыны ў в. Кублішчына Мёрскага раёна. Але разам з тым, ніводная з гэтых дат не падмацоўваецца іншымі крыніцамі. Больш таго, яны паходзяць з дакументаў, створаных у больш познія перыяды (пераважна ў 1920—1940-х гг.). Аналіз жа апублікаваных і архіўных матэрыялаў дазваляе сцвярджаць аб наяўнасці стараверскага насельніцтва ў рэгіёне толькі ў другой палове XVIII стагоддзя. Больш раннія сведчанні іх тут пражывання пакуль не выяўлены.

Такім чынам, прааналізаваўшы апублікаваныя даследаванні па гісторыі стараверства на паўночна-заходніх беларускіх землях у другой палове XVII — першай палове XVIII стагоддзя, прыходзім да наступных высноў. Па-першае, у гістарычных работах не апублікавана фактаў наяўнасці стараверскага насельніцтва ў рэгіёне ў згаданы перыяд, якія б былі пацверджаны даставернымі крыніцамі. Нягледзячы на тое, што ва ўсім комплексе апублікаваных даследаванняў маецца зусім мізэрная колькасць такіх фактаў, але амаль выключна яны падмацаваны познімі крыніцамі (XIX—XX стагоддзяў). У астатніх жа выпадках мы маем справу з дапушчэннямі і аналогіямі даследчыкаў, якія зыходзяць з суседніх рэгіёнаў (паўднёва-ўсходняй Латвіі, усходняй Літвы і паўднёвай Пскоўшчыны). Па-другое, даты паўстання шэ-

рагу стараверскіх абшчын у канцы XVII — пачатку XVIII стагоддзя, якія ў шырокі навуковы дыскурс увёў Г. Паташэнка, пры праверцы і аналізе аказаліся абсалютна не аргументаванымі. Больш таго, падазронае разыходжанне гэтых дат (роўна на 100, 200 і 300 год) з іншымі крыніцамі падштурхоўвае да думкі аб іх наўмысным "састарванні".

Падсумоўваючы вышэйсказанае адзначым, што гісторыя старавер-ства ў паўночна-заходняй частцы Беларусі ў другой палове XVII — першай палове XVIII стагоддзя вельмі сцісла прадстаўлена ў навуковай літаратуры. А таму нявырашанымі застаецца і шэраг канкрэтных пытанняў. Так, не выяўлены месцы першапачатковага рассялення стараверaў у рэгіёне, не вылучаны этапы іх засялення гэтай тэрыторыі, не прадпрынята спроба аналізу інтэнсіўнасці міграцыі, а таксама падліку колькасці прышлага насельніцтва.

Літаратура і крыніцы:

1. Аўсейчык, У. Я. Рассяленне і дэмаграфічная характарыстыка стараверaў паўночна-заходняй Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX ст. / У. Я. Аўсейчык // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 1. Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія. — 2021. — Том 13. — № 1. — С. 57—67.
2. Аўсейчык, У. Я. Стараверы паўднёва-ўсходняй Беларусі: гістарыяграфія і сучасны стан даследаванняў / У. Я. Аўсейчык // Вестник ПГУ. Серия А. Гуманитарные науки. Исторические науки. — 2021. - № 1. — С. 136—146.
3. Волков, В. И. Сведения о начале, распространении и разделении раскола и о расколе в Витебской губернии / В. И. Волков. — Витебск: Тип. Губернского правления, 1866. — 21 + 85 с.
4. Гарбацкі, А. А. Стараабрадніцтва на Беларусі ў канцы XVII — пачатку XX стст. / А. А. Гарбацкі. — Брэст : БрДУ, 1999. — 202 с.
5. Горбацкий, А. А. Старообрядчество на белорусских землях / А. А. Горбацкий. — Брест: БрГУ, 2004. — 305 с.
6. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці
7. Заварина, А. А. Русское население восточной Латвии во второй половине XIX — начале XX века: Историко-этнографический очерк / А. А. Заварина. — Рига : Зинатне, 1986. — 246 с.

8. Лилеев, М. И. Из истории раскола на Ветке и в Стародубье XVII—XVIII вв. / М. И. Лилеев. — Киев: тип. Г. Т. Корчак-Новицкого, 1895. — Вып. 1. — [2], XII, 596 с.
9. Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў (Lietuvos valstybės istorijos archyvas)
10. Літоўскі цэнтральны дзяржаўны архіў (Lietuvos centrinis valstybės archyvas)
11. Маркелов, Г. В. Дегуцкий летописец / Г. В. Маркелов // Древлехранилище Пушкинского Дома: материалы и исследования / АН СССР, Ин-т рус. лит. (Пушк. Дом) ; [редкол.: В. П. Бударагин, А. М. Панченко, Н. В. Понырко]. — Ленинград: Наука, 1990. — С. 166—248.
12. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі
13. Памятная книжка Виленского генерал-губернаторства на 1868 год /под ред. А. М. Сементовского. 1868. I, [1], IV, 499 с., [10] л. ил., карт.: ил., табл.
14. Поташенко, Г. Староверие в Литве: Вторая половина XVII — начало XIX вв. Исследования, документы, материалы / Г. Поташенко. — Вильнюс: Aidai, 2006. — 543 с.
15. Станкевич, А. Очерк возникновения русских поселений на Литве / А. Станкевич. — Вильна: Губернская типография, 1909. — [2], 140 с.
16. Хронограф Литовский, сиречь Летописец степенный древлеправославного христианства / Подг. Н. Морозовой и Г. Поташенко. — Вильнюс: Вильнюсский университет, 2011. —329 с.
17. Anoszko, S. Staroobrzędowcy na białoruskich ziemiach Rzeczypospolitej Obojga Narodów w XVII-XVIII stuleciu / S. Anoszko // NURT SVD: półrocznik misjologiczno-religioznawczy. — 2020. — Z. 1. — s. 93—111.
18. Archiwum Akt Nowych. — Zespół 14: Ministerstwo Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego w Warszawie. — Sygnatura 1270: Kościół Staroobrzędowy nieuznający hierarchii (1922—1939).
19. Breslaujos dekanato vizitacija 1782—1783 m., atlikta Vilniaus vyskupo Ignoto Jokūbo Masalskio parėdymu / Firkovičius, Romualdas, parengė [edt]. — Vilnius : Katalikų akademija, 2008. — XI, 464 p.
20. Hedeman, O. Historja powiatu Brasławskiego / O. Hedeman. — Wilno: Polska Druk. Nakładowa «Lux», 1930. — 434 s.
21. Pastuszewski, S. Staroobrzędowcy na ziemiach białoruskich / S. Pastuszewski // Roczniki Bialskopodlaski. — 2015. — T. XXIII. — S. 159—207.